Відаць, жорсткасць пачала набываць жаночыя рысы. З чатырох наўмысных забойстваў, што зарэгістраваны міліцыяй на апошнім тыдні на Гродзеншчыне, тры ўчынілі прадстаўніцы слабага полу. 31-гадовая жыхарка вёскі Жытомля Гродзенскага раёна, не знайшоўшы ў час спрэчкі з мужам іншых аргументаў, схапілася за кухонны нож. У выніку 41-гадовы мужчына памёр на месцы.

Праз некалькі дзён такім жа чынам адправіла на той свет свайго 45-гадовага мужа, які працаваў вадзіцелем, 46-гадовая жыхарка вёскі Астроўля, што недалёка ад Ліды. А 49-гадовая жыхарка вёскі Погіры Дзятлаўскага раёна абышлася без нажа. Яна забіла свайго сужыцеля-равесніка металічным прутом.

Як вынікае з міліцэйскіх пратаколаў, у двух выпадках спрэчкі ўзніклі пасля сумеснага распіцця ахвярамі і іх забойцамі спіртных напіткаў, у адным — муж прыйшоў дадому п'яны.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.

Палац Пацёмкіна — для трэцяга стагоддзя?

Будаўнікі і рэстаўратары зноў пачалі рэканструкцыю палаца князя Рыгора Пацёмкіна ў Крычаве, якая была прыпынена. Гэты двухпавярховы будынак на 61 пакой і дзве круглыя залы быў узведзены ў 1778-1787 гадах у стылі класіцызму. Мяркуецца, што над яго праектам працаваў архітэктар Іван Старой — аўтар Таўрычаскага палаца ў Санкт-Пецярбургу. Пазней князь Пацёмкін прадаў Крычаўскі маёнтак разам з палацам памешчыкам Галынскім, і яны перабудоўвалі яго пад псеўдагатычны стыль.

Дзесяць гадоў таму палац вырашылі перадаць пад Крычаўскі краязнаўчы музей. Тады ж і пачалі яго рэстаўрацыю, якая зацягнулася на дзесяцігоддзе з-за недахопу сродкаў.

Мікалай НАЗАРОВІЧ, БелТА.

Матывы

"Гальшанскі замак" мастака Пётры Шарыпы

Мастак Пётра Шарыпа належыць да тых творцаў, чый голас у хоры беларускіх жывапісцаў можна назваць ціхім. Але з кожным годам гэты голас мацнее і набывае сваё адметнае гучанне. Сёння ён чуцен не толькі ў сваёй краіне, але і далёка за яе межамі. Шарыпа — майстра лірычнага пейзажу. На ягоных палотнах — краявіды і помнікі дойлідства, створаныя ў пастаянных вандроўках па Беларусі. Сярод іх вылучаецца серыя твораў, напісаных на Ашмяншчыне, у старажытных Гальшанах. Асноўны матыў палотнаў — касцёл францысканцаў і руіны старажытнага замка. Частка гэтай серыі твораў экспануецца зараз у Гальшанскім філіяле Нацыянальнага мастацкага музея, які месціцца ў скляпеннях манастырскага комплексу.

Побач з творамі Пётры Шарыпы — краявіды ягонай дачкі Алены, якая сёлета скончыла Беларускую акадэмію мастацтваў. Разам з бацькам Алена вандравала па Гродзеншчыне. Разам з ім стварала творы, якія зараз можна пабачыць на экспазіцыі.

Дарэчы, ва ўрачыстым адкрыцці вернісажу бралі ўдзел настаўнік і даследчык гэтага краю Эдуард Корзун, старшыня фонду "Гальшанскі замак" Наталля Мяцельская, мастацтвазнаўца Пётр Васілеўскі, старшыня мастацкай суполкі "Пагоня" Аляксей Марачкін.

Ірына ЛЯКСЕЕВА.

Віншуем!

Уладальніца другой прэміі і прыза "Сярэбранае яйка" на "Славянскім базары-97" юная спявачка Марына Жолудзева (Беларусь).

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БелТА.

Дынамаўцы рыхтуюцца да юбілею

Поўным ходам ідзе падрыхтоўка да свята, якое прысвечана 70-годдзю сталічнай футбольнай каманды "Дынама". Правесці ўрачыстасці плануецца 20-21 верасня ў Мінску.

Як паведаміў старшыня аргкамітэта па падрыхтоўцы да юбілею Юрый Курбыка, аматараў футбола чакае нямала цікавага. Балельшчыкі змогуць зноў сустрэцца з кумірамі мінулых гадоў, паслухаць канцэрт вядучых майстроў беларускай эстрады. "Гваздом" свята стане футбольны матч паміж ветэранамі мінскага "Дынама" і "Зеніта" з Санкт-Пецярбурга або маскоўскага "Дынама". Чакаецца, што ўспомніць маладосць на поле выйдуць Эдуард Малафееў і Міхаіл Мустыгін, Сяргей Алейнікаў і Георгій Кандрацьеў, Ігар Гурыновіч і Міхаіл Вергеенка, а таксама многія іншыя футбольныя "зоркі" мінулага.

Да юбілею будуць выпушчаны памятныя вымпелы, значкі, наклейкі і іншая сувенірная атрыбутыка з дынамаўскай сімволікай.

Зразумела, што для правядзення ўрачыстасцей патрабуецца нямала сродкаў. Частку затрат возьмуць на сябе Міністэрства спорту і турызму, Беларускі савет "Дынама", футбольны клуб "Дынама" /Мінск/, Міжнародны фонд ветэранаў беларускага футбола, а асноўны цяжар фінансавых затрат ляжа на плечы спонсараў. Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў ужо выйшлі на сувязь са штабам свята і пачалі ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. Дарэчы, звязацца з арганізатарамі юбілею можна па тэлефонах Беларускай федэрацыі футбола — 276-89-33 або фонду ветэранаў — 245-19-97.

Ігар ХАДАСЕВІЧ.

Навізна?

Лоцвіны чакаюць даследчыкаў... гулавога эфекту. У надоях малака

На Капыльшчыне ўзнікла сапраўднае "паляванне" на... глушыцелі кампрэсараў даільных установак. Цяпер з-за іх адсутнасці два разы ў суткі з калгасных фермаў даносіцца да навакольных вёсак магутны гул (пры спадарожным ветры грукат "нагадвае" аб сабе на адлегласці да 7—10 км). Але начальства не спяшаецца аднаўляць даільныя апараты. Яму так "спакайней" — з дому чуваць, што каровы дояцца. Не трэба, зразумела, кантраляваць працу жывёлаводаў.

На жаль, яшчэ не праведзена навуковае даследаванне (магчыма, з-за гэтага праяўляецца нетаропкасць), наколькі павышаны гул уздзейнічае на надоі. Таму, як кажуць, тэмы для будучых дысертацый кандыдатаў і дактароў навук ёсць.

Валянцін КЛЯПКО.

Прэм'еры

"Травіята" на Беларусі. Новая

Самая першая прэм'ера оперы Джузепе Вердзі "Травіята" праваліпася. Камусьці не спадабалася яе тэма — цяжкі лёс паўшай жанчыны. Але хутка "Травіята" заваявала ўвесь свет. І ў Мінску днямі адбылася прэм'ера новай пастаноўкі бессмяротнай оперы. Перад пачаткам спектакля мне давялося некалькі хвілін паразмаўляць з рэжысёрам — пастаноўшчыкам спектакля Сусанай Цырук.

— Сусана Юр'еўна, адкажыце, чаму Вы выступаеце менавіта ў ролі рэжысёра? Наколькі я ведаю, Вы — заслужаная артыстка Расіі, у мінулым — старшы канцэртмайстар Санкт-Пецярбургскага камернага тэатра...

— Калі была маленькай, маці, якая працавала ў беларускім оперным тэатры, заўсёды брала мяне з сабой. Фактычна тут прайшло маё дзяцінства. Я тут усё добра ведаю. І мяне таксама ведаюць. Рэжысёрам стала таму, што так склаўся мой лёс. І іншага я не хачу.

— Здаецца, у "Травіяце" нічога новага быць не можа. І якая б ні была пастаноўка, гэты спектакль усё роўна па-ранейшаму застаецца добра знаёмы гледачам...

— На мой погляд, любое новае пачынанне — гэта аўтарская ініцыятыва і інтэрпрэтацыя. "Травіята" — мая першая так званая дарослая пастаноўка ў Мінскім тэатры оперы і балета. І аснова спектакля — успаміны Альфрэда, аднаго з галоўных герояў.

— Не вельмі палохаецеся перад прэм'ерай?

— Па натуры я аптыміст. І веру, што ўсё пройдзе добра і новая "Травіята" знойдзе сваіх прыхільнікаў. Бо, як гаворыцца ў прымаўцы, калі зачыняюцца дзверы, дзе-небудзь адчыняюць вокны. Хацелася б, канешне, спадзявацца, што для мяне будуць адчыненыя і дзверы, і вокны...

Вера КРОЗ.

Як ратаваць людзей на вадзе?

У самым разгары лета. Многія жыхары краіны цяпер ахвотна праводзяць вольны час на берагах нашых рэк і азёр. Але радасць далучэння да прыроды нярэдка азмрочваецца трагічнымі выпадкамі гібелі людзей. Дастаткова сказаць, што за 6 месяцаў бягучага года на вадаёмах рэспублікі пацярпелі бедства 655 чалавек, 197 з іх — дзеці. Не ўдалося своечасова прыйсці на дапамогу і выратаваць 359 чалавек, у тым ліку 39 дзяцей.

У параўнанні з такім жа перыядам мінулага года практычна ва ўсіх абласцях, акрамя Гродзенскай і горада Мінска, назіраецца рост колькасці няшчасных выпадкаў, якія прывялі да гібелі людзей: у Мінскай — на 36 працэнтаў, Гомельскай — на 34, Магілёўскай — на 25, Віцебскай — на 20, у Брэсцкай вобласці — на 17 працэнтаў.

Аналіз прычын здарэнняў сведчыць: асноўнымі з іх, якія прывялі да трагедый, былі парушэнні правіл паводзін на вадзе.

БелТА.

Письмо простого человека

Пять лет такой жизни не выдержу физически

Здравствуйте, уважаемая редакция!

Критика существующего режима — хорошо, но где выход? Почему в газете кроме спорных программ лидеров оппозиции нет конструктивных редакционных статей или других дельных предложений? Какой выход? Что делать? Ведь дальше так жить просто невозможно!

Мало того, что унизительны те безобразия, что творятся в области морали и права, так ведь просто физически становится жить невозможно.

Смотрите. У меня высшее образование, всегда занимала не самые последние должности, принадлежала к так называемому среднему классу. Что теперь? Я работаю главным бухгалтером небольшой государственной организации (могу перейти на должность зам. главного бухгалтера на большое производственное объединение, но там нерегулярно платят), в коммерцию идти боюсь, потому что привыкла работать честно. Получаю 2,8 миллиона рублей чистыми. Из них сразу покупаю 50 долларов — сыну на учебу в БККУ (800 долларов в год). Парень почти отлично учится — надо учить, а попробовали в государственный вуз поступать в прошлом году, нам открытым текстом сказали: "1500 долларов — и ваш сын студент". Где взять? А ежемесячно откладывая по 50 долларов и не отдыхая в отпуске, еще можно кое-как собрать 800 долларов в год.

Но вот именно "кое-как". Смотрите, как: перешли на самую дешевую (читай: некачественную) пищу, мой гастрит перешел в эрозию желудка. Оба похудели, из одежды — ничего не покупаем, донашиваем старое, а ведь парню хочется одеться! Да и я еще не старуха. Дальше — чтобы не покупать картошку, разработали дополнительный участок, сын не всегда туда доезжает (учится!), участок, как и весь огород, в основном на мне. Из-за большой физической нагрузки два раза срывала спину, недавно четыре недели отбыла на больничном, предлагали госпитализацию. Теперь от нервов, от хронического безденежья — сужение сосудов и синдром позвоночной артерии. В общем, за год — букет болезней! И главное — никакого просвета! Пять лет такой жизни я не выдержу физически.

А если не учить сына, то куда он может пойти работать? Даже с дипломами молодые люди не могут получить работу. Будет болтаться без дела, и куда эта дорожка приведет? И свою судьбу сломает, и для общества проблема молодежной преступности стоит очень остро. Что же делать, как жить? Порой до такого отчаяния дохожу!

И зачем я все это пишу? У вас таких писем, наверно, миллионы. У каждого свои проблемы. У вас тоже... свои. Вот только, где взять силы, здоровья и духа, чтобы решить их и как-нибудь пережить это время? Вообще, в чем смысл жизни? Для чего человек живет? Сначала трудишься не покладая рук на собственное образование, благополучие, чтобы заработать квартиру, мебель, телефон, пашешь на участке. И когда чуть-чуть становишься на ноги, подрастают дети, надо работать на их образование, благополучие и т.д. по кругу. А потом будут внуки... Это у всех людей так, или в других странах люди все же по-другому живут? Да даже у нас раньше жить легче было! Да даже прошедшей осенью и зимой мы лучше питались, чем теперь. Я не понимаю, почему статистика говорит только о 3—5 процентах инфляции ежемесячно? Только стоимость вареной колбасы с апреля возросла в 1,5 раза, т.е. на 50 процентов, или на 17 процентов в месяц. Эх, да что говорить!

Главное, не понимаю: если всем так тяжело стало, почему люди молчат? Почему все вместе, используя свои законные права, не выйдут на улицы, как было в апреле, по-моему, 92-го? Надо что-то делать, потому что бездарное руководство со своими амбициями приведет страну к полной парализации. А на бытовом уровне людям просто нечего будет есть, и начнутся грабежи, разбои. У меня и так на участке в прошлом году выкопали большую часть картошки, а у соседки из теплицы покрали перцы и помидоры.

Ну ладно, закругляюсь, и так большое письмо. Высылаю талон, хотя и не надеюсь выиграть, потому что за всю свою жизнь не выиграла ни рубля: рука невезучая. Ну хоть выговорилась, хотя говорить на эту больную тему можно долго. До свидания. Желаю газете успехов и упрочить свои позиции.

С уважением —
Людмила КЛЮЧНИКОВА.

Не магу маўчаць

Як можна выкарыстаць бюлетэні?

Ёсць, напэўна, розныя спосабы. Але з такім, пра які я раскажу, рэдка хто сустракаўся.

У лютым 1997 года мне давялося ляжаць у гарадской бальніцы. Там я сустрэлася з рэдкім спосабам "выкарыстання" бюлетэняў. Бюлетэні рэферэндуму і выбараў служылі медсёстрам паперай, на якой яны пісалі накіраванні хворым на працэдуры, а таксама рабілі "варонкі", куды клалі таблеткі. Гэтыя ж бюлетэні выкарыстоўваліся ў якасці паперы і ў статыстычным аддзеле бальніцы. А трапілі яны сюды, мабыць, з аблвыканкама.

На маю думку, нявыкарыстаныя бюлетэні і выкарыстаныя павінны быць на строгім уліку, дзесьці захоўвацца, а не служыць у якасці паперы.

Мы ўжо прагаласавалі за зямлю, за саюз, за двухмоўе, за прэзідэнцкую Канстытуцыю. Усюды атрымалі "адзінадушную падтрымку". Засталося нам прагаласаваць, прабачце, за атамную вайну. Калі такім спосабам будзе праходзіць галасаванне, то і гэтае пытанне атрымае "ўсенародную падтрымку".

Марыя ШУМСКАЯ.
Гродна.

ЮНЭСКА,
Генеральнаму сакратару

Ліст дзеячаў беларускай культуры і прадстаўнікоў грамадскасці ў абарону Беларускага фонду Сораса

Кіраўніцтва Беларусі санкцыянавала праверку фінансавай дзейнасці Беларускага фонду Сораса, якую абставіла галаслоўнымі палітыканскімі абвінавачваннямі. Фонду выстаўлены штраф у 2,9 мільёна долараў — быццам бы за нявыплату падаткаў (а рахунак Фонду заблакаваны), хаця дабрачынная дзейнасць у цывілізаваным свеце ніякаму падаткаабкладанню не падлягае.

Мэтай усёй гэтай акцыі было, па-першае, сарваць дармовы куш з недзяржаўнай арганізацыі; па-другое, падставіць пад "дамоклаў меч" само функцыянаванне гэтай арганізацыі, якая працуе на карысць нацыянальнай культуры; па-трэцяе, запусціць у грамадскі абыход дэзінфармацыю дзеля прапагандысцкага прыбытку. Падобныя захады магчыма ажыццяўляць толькі ў краіне, дзе беззаконне сталася нормай для ўладаў.

Зразумела, што ні з ідэалагічнай падкладкаю праверкі, ні з яе вынікамі (казуісцкая спасылка на... адсутнасць у рэспубліканскім заканадаўстве адпаведнага юрыдычнага палажэння пра дабрачынныя арганізацыі робіць саміх дабрачынцаў вінаватымі!) Фонд катэгарычна не згадзіўся і накіраваў афіцыйныя пярэчанні ў падатковую інспекцыю. 15 траўня заснавальнік Фонду спадар Джордж Сорас даслаў ліст прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку з просьбай спыніць пераслед дабрачыннай арганізацыі. У той жа дзень было абвешчана пра згортванне дзейнасці Фонду.

Больш як за чатыры гады свайго існавання Беларускі фонд Сораса дапамог здзейсніць мноства непасільных для дзяржавы праграмаў, скіраваных на развіццё беларускай культуры і адукацыі, забяспечыў шмат дзяржаўных і недзяржаўных устаноў сучаснай відэа-, электроннай і іншай тэхнікай, а таксама паспрыяў лячэнню і аздараўленню насельніцтва (найперш дзяцей), якое пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы.

Цяжкія наступствы ад згортвання дзейнасці Фонду відаць ужо зараз, і яны шматкратна павялічваюцца з кожным днём. Замест свайго прамога абавязку — падтрымліваць культуру — дзяржава наўмысна вынішчае адно з жыватворных рэчышчаў такой падтрымкі. Ніякага аб'ектыўнага апраўдання гэткай палітыкі няма і быць не можа.

Таму мы заяўляем поўную нязгоду з санкцыямі ўлад супраць Беларускага фонду Сораса і рашуча патрабуем спыніць пераслед ягонай дзейнасці. Мы не маем права змаўчаць пра чарговы здзек з нашай культуры і з самой годнасці Беларусі ў свеце.

Ліст падпісалі 230 чалавек.

Что мешает построить общий кавказский дом

Добрососедство — утопия или реальность? Могут ли люди, населяющие Кавказ, найти в себе силы объединиться?

Недавно я стал свидетелем уникального события. В Москве, в некогда известном Доме дружбы, проходил музыкальный фестиваль кавказских детей, проживающих в столице России. Сидели рядом грузины и абхазы, азербайджанцы и армяне, осетины и кабардинцы, ингуши и дагестанцы. Русские аплодировали чеченцам, армяне — азербайджанцам, грузины — абхазам. Если можно так спокойно собраться вместе в Москве, почему же соплеменники на родном Кавказе проливают кровь друг друга?

Инициативу создания общего кавказского дома выдвинули грузины, затем к ней подключились азербайджанцы. С недавних пор этими идеями загорелись россияне.

Объединение кавказских народов и государств нынче маловероятно. Но помирить их можно. Для начала необходимо понять, кто мог бы выступить в качестве посредника, кто обладает реальным влиянием на эти народы. Есть несколько вариантов. Первый — это модель Запада, предполагающая для налаживания интеграции посредничество международных организаций, — той же ООН или ОБСЕ. Второй вариант — российский. Третий предусматривает создание кавказского общего дома без посредников под руководством наиболее авторитетного лидера. Четвертый вариант — иранская или турецкая модель, его выдвинула азербайджанская дипломатия.

В чем заключается особенность первого варианта? Запад в виде посредника выглядит весьма заманчиво. Это сулит многомиллионные кредиты, помощь, включая технологическую, развитие демократических процессов. Все понимают, что взамен придется расплачиваться частью своего сырья или стать транзитной зоной, но этот вариант сотрудничества многих устраивает. К сожалению, из-за неопределенной кавказской политики России он пока неосуществим.

Российский вариант сводится к следующему: все процессы интеграции должны проводиться под эгидой и по указке из Москвы. Главным хозяином региона должна быть Россия, без ее ведома Запад не имеет права войти в самостоятельный контакт с каким-либо из кавказских государств или народов. Может, кто-то и согласился бы на это, но только если Россия экономически станет их поддерживать. Но у Москвы таких возможностей нет. То есть народы должны выживать сами, но всю экономическую власть передать Кремлю.

В свое время, отобрав экономическую инициативу у субъектов Федерации, Москва спровоцировала развал СССР. Применение российского варианта на Кавказе предвещает подобное и с Российской Федерацией. Уже сейчас в регионе набирают скорость центробежные силы. Ясно, что у российской модели будущего нет.

Третий вариант предусматривает создание равноправной наднациональной структуры во главе с общекавказским лидером или руководителем одного из кавказских государств. В последнее время в качестве такового часто предлагают себя президент Грузии Эдуард Шеварднадзе и лидеры Чеченской республики Ичкерия. Грузия предлагает создать межпарламентскую ассамблею кавказских народов, а Чечня — кавказскую ОБСЕ.

Турция официально не заявляла о своих планах по усилению своего влияния в кавказском регионе. Однако, за исключением Армении, турецких бизнесменов и строителей можно встретить практически на всем Кавказе. Много здесь и неплохой, и при этом недорогой, турецкой продукции. Но турецкую модель нельзя считать самостоятельной, она является частью европейской, поэтому вряд ли в ближайшее время Кавказ может перейти под влияние Турции.

Выходит, ни один из вышеперечисленных вариантов не может самостоятельно привнести мир на землю Кавказа. Где же искать выход из сложившегося положения?

На мой взгляд, наиболее удачную формулу кавказского общего дома выработала азербайджанская дипломатия. Этот вариант опирается на концепцию сбалансированной политики на Кавказе, учитывает политические и экономические интересы всех государств, ведение в регионе сбалансированной политики. В частности, объявляется политика открытых дверей, устанавливаются добрые отношения со всеми одновременно, предлагаются различные формы интеграции. Различия в уровнях развития не становятся преградой сотрудничеству.

По мнению Баку, на Кавказе большинство государств ведут неправильную игру, поскольку ориентируются на какую-либо одну державу. Естественно, это не гарантирует данной стране независимость. Государства региона, включая Россию, должны учесть взаимные интересы и отказаться от применения или угрозы применения силы друг против друга, стремиться к мирному диалогу и всестороннему сотрудничеству и одновременно открыть свои двери для мирового капитала.

Самый главный вопрос сегодня адресуется прежде всего России: хотят ли русские войны? Судя по всему, в Кремле и в Белом доме нет единства мнений по этой проблеме. Тем не менее на этот вопрос ответить придется. Если и далее будет проводиться политика силового давления на Кавказе, то ничем, кроме войны, это не может кончиться. Если же будет построен общий кавказский дом, в этот древний край наконец-то придет мир.

Рустам МАМЕДОВ,
политолог.

Баку.

Российская Федерация

Согласно декларации о доходах, в 1996 году Черномырдин заработал немногим более 46 миллионов рублей

Годовой доход (зарплата) премьер-министра Виктора Черномырдина в 1996 году составил 46 млн. 389 тыс. 432 рубля. Суммарная стоимость недвижимости, которой совместно владеют премьер и его супруга, а также автомашины В.Черномырдина, составляет 268 млн. 350 тыс. 16 рублей.

Об этом говорится в декларации о доходах и имуществе, направленной премьером в налоговую инспекцию по месту жительства.

Это было сделано в соответствии с Указом президента РФ Бориса Ельцина от 15 мая "О предоставлении лицами, замещающими государственные должности государственной службы и должности в органах местного самоуправления, сведений о доходах и имуществе". Ранее подобные декларации представили Б.Ельцин, первые вице-премьеры Анатолий Чубайс и Борис Немцов.

На праве совместной собственности с супругой В.Черномырдину принадлежат земельный участок в Подмосковье площадью 1473 кв.м и построенный на нем жилой дом (315,1 кв.м). Стоимость дома и земельного участка составляет 156 млн. 350 тыс. 16 рублей.

В интервью "Интерфаксу" В.Черномырдин сообщил, что строительство дома на принадлежащем ему участке было закончено за несколько месяцев до назначения вице-премьером правительства.

В.Черномырдиным также приобретен джип-внедорожник "Шевроле-Блейзер". Стоимость машины — 112 млн. рублей.

Согласно декларации, премьер по договору о найме пользуется также квартирой в Крылатском общей площадью 148,7 кв.м.

"Может быть, это не в духе времени, но никаких ценных бумаг у меня нет, — сказал В.Черномырдин. — Как нет и никакой недвижимости за рубежом. А что касается машины, то, к сожалению, поездить на ней удается крайне редко", — добавил глава Кабинета министров.

Трудно быть ребенком Мадонны

Знаменитая певица хочет, чтобы у ее дочери была нормальная жизнь

Рождение у 38-летней Мадонны дочери, окрещенной Лурдес Марией Чиконе, стало, если судить по резонансу в прессе, едва ли не событием мирового значения. Говорили, что отец ребенка — кубинский тренер-физкультурник, 30-летний Карлос Леон — за большие деньги подписал документ, в котором он отказывается от отцовства. "Верно ли, что отец вашего ребенка, ставший вашим личным тренером, — Карлос Леон — для вас не более чем красивый и здоровый мужчина с отличными генами?" — с этого вопроса началось интервью Мадонны французскому журналу "Пари-матч".

— Так утверждают масс-медиа. Я, дескать, бесчувственное, создание, которое наплевательски относится к людям. Я, мол, амбициозна, холодна, расчетлива. А я испытываю к Карлосу Леону настоящую любовь.

— Еще говорят, что вы заставили его подписать документ об отказе от всех отцовских прав на ребенка?

— Это очередная идиотская выдумка людей, которые меня не знают и которые вмешиваются в то, что их не касается. Подобные утверждения меня очень ранят.

— Вы уверены, что будете хорошей матерью?

— В этом нет никакого сомнения. Я уже хорошая мать.

— Ваша мать умерла, когда вам было всего 6 лет. И именно отсутствием матери часто объясняют ваше стремление во всем преуспеть и постоянно находиться в огнях рампы как в профессиональной, так и в частной жизни.

— У меня много друзей, у которых есть мать, но это не мешает им быть полностью поглощенными работой и не желать связывать себя семьей. Многие женщины, как и я, ждут 30 с лишним лет, чтобы иметь детей. Как бы то ни было, я действительно хотела бы многое успеть до того, как родить первого ребенка.

— Какими вы видите ваши материнские обязанности?

— Ребенок подобен белому полотну, на котором отпечатываются достоинства и недостатки его родителей. Этот аспект материнства вызывает у меня беспокойство. Чтобы быть хорошим родителем и образцом для ребенка, надо быть счастливым человеком и преуспеть во всем, что вы делаете в жизни.

— Вашу дочь ждут нелегкие испытания — так трудно быть "ребенком Мадонны". На нее безжалостно набросятся все средства массовой информации.

— Пусть они занимаются своим делом, но не смеют приближаться к ней. Я не собираюсь выставлять ее напоказ перед фотоаппаратами. Я не позволю ее эксплуатировать и не буду воспитывать ее по своему образу и подобию. Хочу, чтобы у нее была нормальная жизнь. Она будет убирать сама свою постель, наводить порядок в комнате.

— Вы хотите иметь еще детей?

— Да, мне, конечно, хотелось бы еще иметь нескольких. И я уже много времени в своей жизни уделяла детям.

— О каких детях вы говорите?

— О взрослых детях, точнее — о мужчинах. Здесь у меня много опыта.

— Действительно, среди них были актеры и режиссеры. Шон Пенн, Уоррен Битти, фотомодель Тони Уорд, баскетболист Деннис Родман, поэт-музыкант Генри Роллинз и т.д. Пресса утверждает, что вы настоящая хищница.

— Должна признать, что мужчины не знают, как себя вести со мной. Большинство из них имеют обо мне столь превратное представление, что, знакомясь со мной, сразу чувствуют себя совершенно потерянными.

— Собираетесь ли вы снова выйти замуж?

— Я не думаю, что брак является чем-то религиозным. Это, скорее, дело экономическое. В нем главную роль играют деньги, а не что-то иное. Так случилось потому, что женщины раньше не могли позаботиться о себе в финансовом отношении. Поэтому они становились собственностью мужей.

— Однако когда вы вышли замуж за Шона Пенна, речь уже не шла о деньгах, вы уже были богаче, чем он...

— Действительно, но я была гораздо моложе и о деньгах не думала. В любом случае ни кусок бумаги, ни разные церемонии не помешают мне жить с мужчиной, которого я люблю.

— Что же для вас самое важное сегодня?

— Дочка. Благодаря ей мелкие глупые заботы, которые раньше действовали мне на нервы, уже не имеют значения. Как и все те гадости, которые пишут обо мне в газетах...

Париж.

Украина

Леонид Кучма отвергает упреки в односторонней внешнеполитической ориентации Украины

Украина намерена утверждаться в Европе и мире как цивилизованное государство с миролюбивой политикой, заявил президент Леонид Кучма на встрече с выпускниками высших военных учебных заведений, получившими дипломы с отличием и золотые медали.

Президент подчеркнул, что Украина и в дальнейшем будет стремиться к "оптимизации" отношений со всеми государствами, международными организациями.

Те, кто обвиняет руководство Украины "в односторонней ориентации, мягко говоря, грешат против истины", заявил Л.Кучма.

Он вновь подчеркнул важность подписанной в Мадриде Хартии Украина—НАТО, заявив, что "отныне НАТО уже не будет символом угрозы и зловещим жупелом".

По мнению президента, Украина, как признанное государство Центральной и Восточной Европы, значительно расширила рамки сотрудничества с НАТО, укрепив этим свою безопасность, и одновременно стала существенным фактором стабильности в Европе.

Отметив успехи Украины на международной арене, Л.Кучма заявил, что это — свидетельство "сбалансированности и взвешенности внешней политики страны, ее соответствия национальным интересам".

Говоря о роли армии в государстве, президент выделил перспективную задачу создания современных, небольших по численности, хорошо оснащенных и боеспособных национальных вооруженных сил, "считаясь с экономическими возможностями страны".

"Интерфакс".

19—26 ліпеня

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

■ ВЫСТАВЫ

Нацыянальны мастацкі музей прапануе пазнаёміцца з выставамі жывапісу В.Шкаруба і А.Шастакова. Таксама тут працуе экспазіцыя керамічных твораў Віктара Гаўрылава, прымеркаваная да 70-годдзя з дня яго нараджэння. Днямі тут адкрылася экспазіцыя традыцыйнага жывапісу тайваньскага мастака Хаунга Куангана.

У Палацы мастацтваў — *да 21 ліпеня* працуе выстава, прымеркаваная да 50-годдзя з дня нараджэння мастакоў-манументалістаў Юрыя Багушэвіча і Генадзя Жарына. Таксама тут можна пазнаёміцца з экспазіцыяй, прысвечанай памяці народнага мастака Беларусі Анатоля Анікейчыка. На выставе прадстаўлены станкавыя скульптуры, партрэты і фотаматэрыялы, якія распавядаюць пра жыццё і творчы шлях мастака. *23 ліпеня* тут адкрываецца выстава жывапісу мастака з Гомеля Станіслава Дзыканава, прымеркаваная да яго 65-годдзя.

У Нацыянальным музеі гісторыі Беларусі *да 22 ліпеня* можна пазнаёміцца з творчасцю сям'і Іваноўых (жывапіс, габелен, графіка), а таксама акунуцца ў свет "Казачных фантазій".

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае наведаць адкрыўшуюся пасля генеральнай рэканструкцыі залу, якая распавядае пра трагедыю беларускага народа ў перыяд фашысцкай акупацыі. Наведвальнікаў музея чакаюць дзве выставы: "Радавыя Перамогі" і "Светлая памяць". Першая прысвечана ваенным лёсам простых салдат, а другая экспануе творы выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

У Чырвоным касцёле святых Сымона і Алены можна пазнаёміцца з мастацкай выставай "Беларускія калюмбы" з калекцыі Анатоля Белага, старшыні клуба "Спадчына", члена Саюза мастакоў Беларусі, рэдактара альманаха клуба "Спадчына".

У Палацы культуры трактарнага завода кожную нядзелю праходзіць кніжная выстава-кірмаш.

У Палацы спорту працуе летняя выстава-кірмаш.

■ КАНЦЭРТЫ

У Палацы прафсаюзаў

25 ліпеня — у праграме "Ну, что ты думаешь об этом?" прэзентуе свой кампакт-дыск група "Новый Иерусалим". У канцэртным шоу бярэ ўдзел аўтар-выканаўца Дзмітрый Даўкш.

■ ТЭАТРЫ

У Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета

18 ліпеня — **ПРЭМ'ЕРА!** Дж.Вердзі "Травіята", опера ў трох дзеях.

20 ліпеня — закрыццё сезона тэатра оперы. "Травіята".

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача закрыў свой тэатральны сезон, але, нягледзячы на гэта, акцёры пад пільным кіраўніцтвам рэжысёра-пастаноўшчыка Мікалая Шыйко плённа працуюць над новымі спектаклямі. Так, у тэатры распачата праца над спектаклем "Шчаслівыя жабракі" паводле п'есы Карла Гоцы, на пастаноўку якога Міністэрства культуры выдаткавала 200 мільёнаў рублёў. Таксама праходзяць рэпетыцыі спектакля "Маленькі лорд Фаунтлярой" паводле твораў замежнай класікі.

Падрыхтавала Марына КОКТЫШ.

Дзень у гісторыі

19 ліпеня

■ У 1499 годзе Мінск атрымаў Магдэбургскае права на самакіраванне.

■ У 1821 годзе быў каранаваны англійскі кароль Георг IV. Ягоная жонка Караліна, з якой прынц ужо шмат гадоў жыў асобна, тэрмінова прыехала з Італіі і прад'явіла свае правы на трон, але нават не была дапушчана на каранацыю. Усе магчымыя праблемы вырашыла яе нечаканая смерць праз два тыдні.

■ У 1877 годзе першым пераможцам Уімблдонскага турніра па тэнісе стаў Спенсер Гор.

■ У 1914 годзе Германія абвясціла вайну Расійскай імперыі.

■ У 1919 годзе ў сувязі з польскай акупацыяй быў скасаваны Савет абароны Літоўска-Беларускай рэспублікі.

■ У 1920 годзе ў Гродне на два месяцы паміж польскімі акупацыямі была адноўлена савецкая ўлада.

■ У 1972 годзе Івану Мележу і Івану Шамякіну былі прысвоеныя званні народных пісьменнікаў Беларусі.

■ У 1980 годзе ў Маскве пачаліся XXII Алімпійскія гульні. У той жа дзень алімпійскі агонь быў запалены і на мінскім стадыёне "Дынама". Чэмпіёнамі гульняў сталі беларускія спартсмены Т.Івінская, Б.Ісачэнка, М.Кіраў, А.Логвін, А.Партноў, Л.Тарасенка і інш. "Нашыя" заваявалі 34 медалі, у тым ліку 15 залатых (з іх мінчане — 25 медалёў, у тым ліку 11 залатых).

20 ліпеня

■ Дзень святой Маргарыты, нябеснай заступніцы цяжарных жанчын. Паводле падання, у трэцім стагоддзі Маргарыту праглынуў жыўцом цмок, але яна раздзёрла ягонае бруха і выратавалася.

■ У 1837 годзе ў Лондане адкрыўся першы ў свеце чыгуначны вакзал.

■ У 1919 годзе ў Мінск прыімчаў агітацыйны цягнік "Кастрычніцкая рэвалюцыя" на чале з Міхаілам Калініным.

■ У 1957 годзе Кагановіцкі раён Мінска быў перайменаваны ў Кастрычніцкі — амаль дакладна праз год пасля вываду Лазара Кагановіча са складу Палітбюро ЦК КПСС.

■ У 1972 годзе ТАСС паведаміў пра адкліканне савецкага вайсковага персаналу з Егіпта.

■ У 1976 годзе амерыканскі касмічны карабель "Вікінг" прызямліўся на Марсе і перадаў на Зямлю тэлевізійны рэпартаж пра Пунсовую планету.

■ У 1994 годзе Аляксандр Лукашэнка прыняў прысягу прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

21 ліпеня

■ У 1831 годзе Бельгія адкалолася ад Нідэрландаў і ўтварыла незалежнае каралеўства.

■ У 1917 годзе ў Мінску адкрыўся II з'езд беларускіх арганізацый, скліканы па ініцыятыве Сацыялістычнай Грамады. На з'ездзе была створана Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый, якая выступала за аўтаномію Беларусі ў межах дэмакратычнай Расіі і бясплатную перадачу зямлі сялянству.

■ У 1940 годзе былі ўтвораныя Латвійская, Літоўская і Эстонская ССР.

■ У 1944 годзе савецкія войскі перайшлі былую дзяржаўную граніцу ў раёне Белавежскай пушчы і пачалі вызваленне Польшчы.

■ У 1960 годзе місіс Шырымава Бандаранаіке, удава забітага прэм'ер-міністра Шры Ланкі, заняла пасаду мужа і стала першай у свеце жанчынай на чале ўрада.

■ У 1967 годзе трапіў пад цягнік і загінуў лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Альберт Лутулі, лідэр афрыканскага антыкаланіяльнага руху.

■ У 1969 годзе амерыканскія астранаўты Нейл Армстранг і Эдвін Олдрын выйшлі на першы ў гісторыі чалавецтва шпацыр па Луне.

■ У 1994 годзе Вярхоўны Савет зацвердзіў прэм'ер-міністрам Кабінета міністраў Рэспублікі Беларусь Міхаіла Чыгіра. У той жа дзень Аляксандр Лукашэнка атрымаў новы беларускі пашпарт №1.

Юрась БАРЫСЕВІЧ.

Неуемный рекордсмен

Два новых спортивных рекорда установил известный карельский "гиннессмен" из города Беломорска Валентин Ефимов. Так его прозвали за то, что он все свои упражнения на силу, ловкость и выносливость делает с прицелом на Книгу рекордов Гиннесса. И не без успеха.

Несколько выдающихся достижений северянина уже вошли в эту книгу. В частности, по скоростной гребле на весельной лодке беспрерывно в течение суток или стрельбе из пистолета (также суточной). У него есть рекорды и по ходьбе, и гонке на велосипеде, и даже по скоростному пробиванию метрового льда пешней.

А не так давно неутомимый "гиннессмен", которому скоро исполнится 60 лет, удивил земляков тем, что всего за 3 минуты 21,9 секунды сумел сделать без передышки сто прыжков через скакалку, сто приседаний и сто отжиманий. Второй рекорд еще более впечатляет: одна тысяча приседаний за 14 минут и 1 секунду.

Остается добавить, что Валентин Ефимов всю жизнь активно занимался спортом, много лет работал рыбаком, что тоже связано с большими физическими нагрузками. Он намерен продолжать спортивные эксперименты до тех пор, пока хватить здоровья.

ЭКСТРА-ПРЕСС.

ВЫ ИСКАЛИ? ВЫ НАШЛИ!
Адыгея
АВТОЗАПЧАСТИ ВАЗ
ОПТ И МЕЛКИЙ ОПТ.
1.Знак аварийный 1,1-1,2 у.е.
2.Огнетушитель 2 у.е.
3.Молдинги "LADA", "SAMARA" 5,5 у.е.
4.Помпоры для панели 0,98 у.е.
5.Хомут в ассорт.
6.Контактный предохранитель трамблера 1,2 у.е.
7.Электропроводка на сваи 1,25 у.е.
8.Предохранители (керамика) 0,04 у.е.
9.Комплект прокладок на двигатель 4 у.е.
10.Тормозная 01-099 5,6 у.е.
11.Цилиндр под двигатель 2,75 у.е.
12.Цилиндр на двигатель 1,52 у.е.
13.Корзина сцепления 17 у.е.
14.Диск сцепления (ВАЗ,Москвич) 9,5 у.е.
15.Бензофильтр 0,37 у.е.
16.Масгофильтр 1,69 у.е.
17.Прокладка для бензобака с краном 2,62 у.е.
18.Бензонасос 7,5 у.е.
19.Торможение колодки "LADA","SAMARA" 2,75 у.е.
20.Прокладка радиатора 0,45 у.е.
21.Прокладка на двигатель 0,19 у.е.
22.Клеммы АКБ 0,35 у.е.
23.Ручки на стекла, двери 0,45 у.е.
24.Поршень на поворотка 0,5 у.е.
25.Колодка тормозного пластинка 3,7 у.е.
26.Кружка тормоза 1,5 у.е.
27.Запасная шина 3,7 у.е.
28.Брызговики (2шт.) 1,5 у.е.
29.Свечи "BOSCH" W 7 DC 1,25 у.е.
Тел.: (017) 246-15-62
(017) 268-38-05

Тайна американских индейцев разгадана

Национальная академия питания США представляет

Чероки и ирокезы, индейцы Северной Америки, всегда считали Голденсил средством от многих болезней. Плантации чудодейственного растения в Аппалачских горах охраняли специальные сторожевые отряды, а за хищение всего одного корня Голденсила полагалась смертная казнь. Знахари втайне от всех готовили целебное снадобье по особой технологии, которая держалась в секрете и передавалась из поколения в поколение.

Главным достоинством Голденсила всегда была высочайшая антибактериальная активность. Отвар и настойка корня великолепно справлялись с язвой желудка и различными опухолями, примочки очень быстро заживляли раны и снимали хронические воспаления. О Голденсиле слагались легенды, во время межплеменных войн особой доблестью считалось добыть волшебный корень. Индейские вожди украшали жилище цветущим Голденсилом.

В традициях Национальной академии питания США (NAN USA) скрупулезное изучение опыта врачевания, распространенного среди коренных народов Америки. Проверкой целебных свойств Голденсила несколько лет занималась центральная лаборатория NAN USA. Результаты – поистине ошеломляющие.

Рассказывает консультант агентства "PR-квадрат+" Никитин А.Д.:

— Экспериментальным путем получен препарат "Супер-Голденсил", не только полностью сохранивший свойства старинных индейских снадобий, но и значительно улучшенный. Поэтому в названии есть приставка "супер".

Это естественный очиститель функциональных систем организма. Он помогает оптимальным путем решить главную проблему современного человека — зашлакованность, "загрязненность" организма. Отвратительная вода из водопровода, пища с консервантами, нечистый воздух — все это осаждается в желудке, легких, кишечнике и практически не выводится естественным путем. За полтора месяца "Супер-Голденсил" капитально вычищает кишечник, нормализует состав крови. Биодобавка прекрасно тонизирует и снимает депрессию.

Для тех, у кого проблемы с фигурой, препарат просто незаменим, ведь очень часто лишние килограммы - следствие общей зашлакованности. "Супер-Голденсил" улучшает пищеварение, предотвращает жировые отложения. Причем он имеет эффект продолженного действия, закладывая программу рационального пищеварения на длительный срок.

Формула препарата — ноу-хау NAN USA. Могу сообщить только, что помимо основного ингредиента — экстракта Голденсила в составе "Супер-Голденсила" — укрепляющая иммунную систему вытяжка из корней растения Black Sampson.

"Супер-Голденсил" — не лекарство, а биологически активная добавка к пище, так называемый нутрицевтик. Для приобретения этого препарата не требуется рецепт врача. "Супер-Голденсил" не имеет противопоказаний и побочных эффектов. На Всеамериканском конгрессе диетологов (1995г.) "Супер-Голденсил" отмечен Почетным дипломом как лучший природный очиститель.

Сергей БЕЛОВ.

Получить бесплатную консультацию сертифицированных специалистов **"Супер-Голденсил"** можно по адресу:
г. Минск, пр. Машерова, 75, корпус 1, с 9.00 до 19.00. Без выходных и перерыва.

Здесь также можно приобрести:

- **"Про-Мэн-Экстра "** – биологически активная пищевая добавка, способствует излечению мужчин от аденомы и воспалений предстательной железы.
- **"Супер-Йохимбе Экстракт "** – натуральный продукт для повышения потенции и выносливости у мужчин естественным путем.
- **"Супер-Сжигатель жира №1 "** – натуральный продукт для избавления от лишнего веса и омолаживания организма без диет и физических нагрузок.
